*Святлана Шумская,*
*Аляксей Шумскі*

# СПІС ФАЛЬКЛОРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ І ТРАДЫЦЫЙНАЯ СПАДЧЫНА КЛІЧАЎШЧЫНЫ

У Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь актыўна дзейнічае Рэспубліканская навукова-метадычная рада, якая надае статус нацыянальнага шэдэўра помнікам нематэрыяльнай культуры згодна з Канвенцыяй ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2003 г.), якую Беларусь ратыфікавала ў 2004 годзе [1]. У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь ужо зарэгістраваны сотні аб’ектаў. Яны знаходзяцца пад аховай. Пераважная большасць з іх – помнікі гісторыі і архітэктуры, а таксама адлюстраванні беларускіх гербаў і дзясяткі адзінак нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Большасць аб’ектаў, што ўжо зарэгістравана, з Магілёўшчыны. 16 студзеня 2013 года прынята рашэнне аб наданні дзіцячаму каляднаму абраду «Куры» Клічаўскага раёна статуса нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі.

Калядны абрад «Куры» звязаны з правядзеннем зімовых свят ад Раства Хрыстова да Водахрышча і праводзіцца штогод на Шчодры вечар 13 студзеня. Абрад унікальны тым, што ўдзельнічаюць у ім толькі дзеці (ва ўзросце ад 6 да 14 гадоў). Яшчэ адна цікавая асаблівасць – у калядным гурце няма традыцыйных для калядавання масак-персанажаў, тут не водзяць ні казу, ні мядзведзя, ні каня. Дзяўчынкі і хлопчыкі апранаюцца ў абрадавае адзенне, упрыгожваюць калядную зорку, з песнямі ідуць па вёсцы, і, падыходзячы да хат, спяваюць калядныя святочныя песні. Сярод іх ёсць спецыяльная песня «Куры». Гаспадары хаты ў сваю чаргу частуюць удзельнікаў гурта ежай – смажанымі блінамі, салам і цукеркамі. Абрад завяршаецца з заходам сонца.

Удзельнікамі абраду ў свой час у дзяцінстве былі прадстаўнікі не аднаго пакалення жыхароў вёсак Дзмітраўка, Віркаў і Нясета. Многія з іх сёння – бабулі і дзядулі, бацькі, старэйшыя сёстры – з энтузіязмам распавядаюць сучасным удзельнікам каляднага гурта, як трэба калядаваць, перадаюць ім песні, расказваюць парадак дзеянняў. «Куры» – не адзіны абрад на Клічаўчыне, які неабходна ахоўваць, варты нацыянальнай кнігі нематэрыяльных каштоўнасцей.

Адным з самых цікавых і любімых у народзе свят заўжды былі Каляды. Касцюміраванае шэсце было здалёк відаць і чуваць. Дзе насілі калядную зорку, дзе хадзілі са званком, вадзілі розных цікавых персанажаў: Казу, Мядзведзя. Суполка вёскі Віркаў сёлета ўзнавіла калядны абрад «Цыганы», які многа гадоў таму бытаваў на тэрыторыі населенага пункта.

Каледзіч Н. І., 1937 года нараджэння, некалі сама была ўдзельніцай гурта «Цыганы», таму яна і з’яўлялася галоўным дарадчыкам і крытычным назіральнікам. Яна расказала, як гэта адбывалася у гады яе маладосці. У гурце збіраліся розныя цікавыя персанажы: Цыганка і Цыган з бізуном, Мядзведзь, Малады і Маладая, Svg Паніч і Паненка, «Прыдурак». Гурт хадзіў са званком, свістком. У кожнага персанажа была свая вельмі цікавая роля. Кіравала гуртом Цыганка. Калі калядоўшчыкі ішлі па вуліцы, было чуваць здалёк. Падыходзячы да хаты, Цыганка званіла ў званок і гаспадары чулі, што прыйшлі калядаваць, адчынялі хату. Са словамі «Добры вечар таму, хто у гэтым даму. Пусціце цыганоў пагрэцца. Мы вам не дакучаем. Мы раз у год бываем» гурт заходзіў у хату. Гаспадарам спявалі спецыяльную абрадавую песню «Ой, жаўнеру, жаўнеру…», прытанцоўвалі, свісталі ў свісток і званілі ў званочак. Мядзведзя рабілі два чалавекі, якіх апранaлі ў кажушкі, надзявалі на твар маску. Калі гурт стамляўся спяваць і танцаваць, у ход ішоў «Прыдурак». Ён пачынаў выкідваць розныя жарты: цягнуў у торбу посуд, іншыя рэчы, смешна танцаваў, усяляк звяртаў на сябе ўвагу, каб гаспадары хутчэй адпускалі гурт, які мог парадкам стаміцца за гэты час, без перапынку танцуючы і спяваючы.

У в. Доўгае калядавалі на Багатую Каляду. Хадзілі гуртом, колькасць удзельнікаў адвольная, пераапраналіся ў цыган, часам былі дзед і баба, унукі (бралі малых дзяцей). Такі гурт называўся «калядныя цыгане». Шылі спецыяльныя палатняныя торбы, у якія збіралі тое, што гаспадары давалі. Крычалі пад вокнамі: Гаспадар, адчыняй, ідуць каляды. Чым багаты, тым і рады». Потым сабіраліся ўсе ў адной хаце, частаваліся, песні пелі і танцавалі пад музыку. Звычайна старэйшы з цыган прапаноўваў гаспадару, што ён станцуе на пузе за нейкую асобную плату, і калі гаспадар пагаджаўся, то кідаў на падлогу пугу, з якой хадзіў, і танцаваў на ёй.

У в. Закупленне хадзілі калядоўшчыкі ў выглядзе цыган: цыган, цыганка, цыганяты без музыкі. Найперш прасілі зерне ў гаспадароў. У канцы Каляд 21 студзеня цягнулі барану на дуб – «каляду на дуб». Збівалі некалькі дошак крыжом, рашоткай і вешалі на сук. «Каб буслік не мінуў, гняздо звіў», на тым дубе буслы вадзіліся.

У в. Доўгае «каляду на дуб» не цягнулі, так казалі пра застольнае святкаванне, калі хадзілі сваякі ў госці. На Бедную Каляду, калі садзіліся вячэраць, абавязкова казалі: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці, летам не бывай, а зімой марозь». Варылі куццю, прыносілі сена. Сена клалі ў кут, за ручнік, пад іконы. Стараліся яго скруціць мацней, каб нейкую форму мела. Гэты скрутак называўся «каляда». Перад Вадохрышчам выносілі і аддавалі жывёле, каб паела карова. Прыносілі таксама крупы, якія потым аддавалі курам. На стол ставілі куццю, грыбы, аўсяны кісель – стравы толькі посныя, колькасць адвольная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таксама не забываюцца і танцы. У мэтах захавання танцавальных традыцый Клічаўскага раёна праводзяцца танцавальныя вечарыны, на якія з вялікім задавальненнем ходзяць школьнікі, настаўнікі і бацькі, вучацца народнай харэаграфіі ў гуртках устаноў культуры і адукацыі. Падобная вечарына адбылася гэтай зімой у Бацэвіцкім цэнтр культуры і вольнага часу. Тут прайшлі знаёмствы з носьбітамі нашай спадчыны, якія з’ехаліся з навакольных вёсак і раённага цэнтра. Былі мясцовыя музыкі, работнікі ўстаноў культуры і адукацыі, школьнікі, якія з задавальненнем прасутнічалі на майстар-класах. Танцавалі многа: «Полька» з камандай «улева», калі дзяўчаты пераходзяць да наступных танцораў; «Лявоніха» з асаблівымі рухамі, якая танцавалася не толькі парна, але і сольна; таксама «Карапет», або «Лысы», «Страданія», «Кракавяк», «Падыспань», «Кадрыль». Для моладзі было вельмі цікава тое, што можна было ўбачыць бабуль, а таксама і дзяцей у народных традыцыйных строях, пачуць «жывую» музыку. Сёлета падобная танцавальная вечарына адбылася і ў раённым Доме культуры.

Узнаўляецца ў вёсцы Новая Слабодка каляндарны абрад пераносу свячы на дзень святкавання Святога Мікалая Цудатворца (19 снежня). Да яго рыхтаваліся загадзя. На свята Міколы раніцай у хаце збіраліся пажылыя людзі. Кожны нёс з сабой гарэлку, грошы, страву, ручнікі. Людзі прыходзілі, цалавалі абраз, упрыгожвалі яго ручнікамі. Тыя, што «абракаліся», клалі грошы «на свечкі», або ставілі загадзя прыгатаваныя. У спецыяльную скрыначку, куды насыпалі зерне, ставілі свечкі. Людзі абракаліся: «Каб я жыва была. Каб мае дзеці жывы былі. Каб здаровы былі ўсе ў доме» і інш.

Элементы вясельнага абраду адраджаюцца на матэрыялах вёсак Дзмітраўка і Стары Востраў настаўніцай рускай мовы і літаратуры Востраўскай школы Любчык З. М. У залежнасці ад сацыяльна-бытавога становішча вяселлі былі некалькіх відаў: звычайнае, прымацкае, сіроцкае, удавецкае. Адпаведна кожнаму з іх выконваліся пэўныя абрады і песні. Удава не мела права адзець вянок. Прымацкае вяселле звычайна гулялі ў хаце маладой. Сірата хадзіла раніцай на могілкі «зваць» памерлых бацькоў на вяселле. На вяселлі ёй спявалі шмат сіроцкіх песень. Дзеці разам з дарослымі развучваюць песні і звычаі, удзельнічаюць у адраджэнні элементаў вясельных абрадаў.

Асобныя элементы гэтых абрадаў (песні, танцы, гульні), сімвалічныя дзеянні і звычаі выкарыстоўваюцца сучаснымі фальклорнымі і музычнымі гуртамі, вывучаюцца ў музычных школах, запісваюцца студэнтамі падчас фальклорных экспедыцый, ужываюцца як элемент турыстычнага прадукта для агратурыстычных гаспадарак Клічаўшчыны.

Мы распавялі толькі пра асобныя аб’екты нематэрыяльнай культуры, якія заслугоўваюць увагі ўключэння ў нацыянальную кнігу каштоўнасцей Беларусі. А колькі такіх абрадаў і звычаяў у кожным кутку краіны.

**Спіс літаратуры:**

1. Аб зацвярджэнні Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Указ Прэзідэнта РБ ад 29 снежня 2004 г. № 627 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://kultura.gov.by/document/dzyarzha-nyya-pravavyya-akty-dakumenty-pa-kultury-0. – Дата доступа : 15.04. 2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ